ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
ад 29.11.2019 № 849

# Білеты
# для правядзення экзамену ў парадку экстэрнату
# пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы
# базавай адукацыі
# па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура»

2019/2020 навучальны год

Білет № 1

1. Францыск Скарына – беларускі асветнік і першадрукар.
2. Вобразы Пятра і Сашы ў аповесці Івана Шамякіна «Непаўторная вясна» (1-я кніга пенталогіі «Трывожнае шчасце»).
3. Прачытаць на памяць верш Максіма Багдановіча «Раманс».

Білет № 2

1. Тэма вернасці роднай зямлі ў апавяданні Максіма Гарэцкага «Роднае карэнне».
2. Тэма гістарычнага мінулага Беларусі ў творах беларускіх пісьменнікаў (на прыкладзе аднаго твора Уладзіміра Караткевіча, Леаніда Дайнекі або інш.).
3. Прачытаць на памяць верш Алеся Пісьмянкова «Продкі».

Білет № 3

1. Рамантычныя сюжэты і вобразнасць у творчасці Яна Баршчэўскага (апавяданні «Шляхціц Завальня», «Плачка» са зборніка «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях»).
2. Праблема маральнага выбару ў аповесці Васіля Быкава «Жураўліны крык».
3. Прачытаць на памяць урывак з апавядання Міколы Лупсякова «Мэры Кэт».

Білет № 4

1. Паэма Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра» як выдатны твор беларускай літаратуры эпохі Адраджэння.
2. Грамадзянская, маральна-этычная і філасофская тэматыка вершаў Аркадзя Куляшова («Мая Бесядзь», «Спакойнага шчасця не зычу нікому…», «На паўмільярдным кіламетры», «Нябёсы – акіян, я знаў даўно…»).
3. Прачытаць на памяць верш Янкі Купалы «Явар і каліна».

Білет № 5

1. Жыццёвы і творчы шлях Янкі Купалы.
2. Тэма і ідэя апавядання Віктара Карамазава «Дзяльба кабанчыка».
3. Прачытаць на памяць верш Рыгора Барадуліна «Трэба дома бываць часцей».

Білет № 6

1. Драматургічнае майстэрства Янкі Купалы (п’еса «Паўлінка»).
2. Паказ вайны ў апавяданні Янкі Брыля «Memento mori».
3. Прачытаць на памяць верш Максіма Танка «Дрэвы паміраюць».

Білет № 7

1. Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа.
2. Ідэйна-мастацкі змест апавядання Генрыха Далідовіча «Губаты».
3. Прачытаць на памяць байку Кандрата Крапівы «Ганарысты Парсюк».

Білет № 8

1. Сатырычны і гуманістычны пафас камедыі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта».
2. Вобраз Радзімы ў лірыцы Максіма Багдановіча («Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...»), «Слуцкія ткачыхі» і інш.).
3. Прачытаць на памяць урывак з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля».

Білет № 9

1. Жыццёвы і творчы шлях Максіма Багдановіча.
2. Тэма мастака і мастацтва ў паэме Янкі Купалы «Курган».
3. Прачытаць на памяць верш Паўлюка Труса «Падаюць сняжынкі...» (урывак з паэмы «Дзясяты падмурак»).

Білет № 10

1. Вобраз галоўнага героя ў паэме Канстанціна Вераніцына «Тарас на Парнасе».
2. Паэтычнае асэнсаванне беларускага фальклору і міфалогіі ў баладзе Адама Міцкевіча «Свіцязянка».
3. Прачытаць на памяць урывак з апавядання Уладзіміра Караткевіча «Паром на бурнай рацэ».

Білет № 11

1. Услаўленне гераічных подзвігаў князя Вітаўта ў старажытным беларускім летапісе («Беларуска-літоўскі летапіс 1430 – 1446 гг.» – урывак «Пахвала Вітаўту»).
2. Вобразы галоўных герояў у апавяданні Уладзіміра Караткевіча «Паром на бурнай рацэ».
3. Прачытаць на памяць верш Яўгеніі Янішчыц «Ты пакліч мяне. Пазаві…».

Білет № 12

1. Жыццё і дзейнасць беларускай асветніцы Ефрасінні Полацкай (паводле «Жыція Ефрасінні Полацкай»).
2. Вобразы-антыподы ў паэме Янкі Купалы «Бандароўна».

3. Прачытаць на памяць верш Максіма Багдановіча «Зімой».

Білет № 13

1. Грамадзянская лірыка Янкі Купалы (на прыкладзе аднаго-двух вершаў).

2. Паэма Якуба Коласа «Новая зямля» – мастацкая энцыклапедыя народнага жыцця.

3. Прачытаць на памяць верш Якуба Коласа «Ручэй».

Білет № 14

1. Тэма паэта і паэзіі ў вершы Францішка Багушэвіча «Мая дудка».

2. Адлюстраванне падзей Вялікай Айчыннай вайны ў творах беларускіх пісьменнікаў (на прыкладзе творчасці аднаго-двух аўтараў).

3. Прачытаць на памяць верш Янкі Купалы «Спадчына».

Білет № 15

1. Тэма Радзімы ў паэме Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра».

2. Драматургічнае майстэрства Аляксея Дударава (п’еса «Вечар»).

3. Прачытаць на памяць верш Максіма Танка «Ты яшчэ толькі намёк на чалавека…».

Білет № 16

1. Беларускія летапісы як вытокі мастацкай прозы («Летапіс вялікіх князёў літоўскіх», «Беларуска-літоўскі летапіс 1430–1446 гг.» – урывак «Пахвала Вітаўту»).

2. Пейзажная лірыка Якуба Коласа (на прыкладзе аднаго-двух вершаў).

3. Прачытаць на памяць урывак з паэмы Янкі Купалы «Курган».

Білет № 17

1. Сцвярджэнне ідэі патрыятызму, грамадзянскага абавязку ў прадмове Францыска Скарыны да кнігі «Юдзіф».

2. Аповесць Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». Вобразы галоўных герояў твора.

3. Прачытаць на памяць верш Максіма Багдановіча «Маёвая песня» («Па-над белым пухам вішняў...»).

Білет № 18

1. Ідэйны змест прадмовы Францішка Багушэвіча да зборніка «Дудка беларуская».

2. Тэматычная разнастайнасць паэзіі Яўгеніі Янішчыц «Ты пакліч мяне. Пазаві…», «Чаму ніколі не баюся я…», «Не воблачка, а проста аблачынка…», «Любоў мая…».

3. Прачытаць на памяць верш Алеся Ставера «Жураўлі на Палессе ляцяць».